ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (758) ● Пятніца, 24 кастрычніка ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII



**Многія кафедры фізфака, як і іншых факультэтаў універсітэта, усё цясней звязваюць сваю навукова-даследчую работу з прамысловасцю рэспублікі. Толькі за мінулы навучальны год аб'ём гаспадарча-дагаворных работ склаў каля мільёна рублёў.**

**НА ЗДЫМКУ: інжынер праблемнай лабараторыі В. І. Урэнеў і прадстаўнік завода Т. Сцепанец у момант перадачы новай устаноўкі прадпрыемству.**

**Фота Г. МАРОЗАВА.**

## ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Ва універсітэце праходзіць рэспубліканская канферэнцыя маладых вучоных. Адкрываючы яе, акадэмік АН БССР прафесар А. Н. Сеўчанка пажадаў поспехаў маладым даследчыкам, заклікаў іх працаваць з вялікім творчым напружаннем.

Прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, канферэнцыя адкрылася дакладам акадэміка АН БССР Ф. Д. Гахава «Ленін і матэматыка».

Прадстаўнікі творчай моладзі вну рэспублікі выступілі з цікавымі дакладамі на секцыях. Лепшыя з работ будуць рэкамендаваны да друку.

## НІЧОГА КАНКРЭТНАГА

На белым чыстым аркушы паперы толькі ўверсе радок слоў, падкрэслены тлустай рысай: «Вынікі правядзення падпіскі на газеты і часопісы на 1970 год».

— Не мая віна ў тым, што пад гэтым загалоўкам не паяўляюцца лічбы, а стаяць толькі пытальныя знакі, — гаворыць сакратар камітэта камсамола матфака.— Падпіска праводзіцца, але нічога канкрэтнага сказаць не магу.

Прыблізна тое ж самае гаварылі і адказныя за падпіску на іншых факультэтах. Вядома, цяпер ідзе справаздачна-выбарная кампанія, тым не менш пытанне аб падпісцы павінна ставіцца рубам: заканчваецца тэрмін, абумоўлены ў абавязацельстве. Аб гэтым якраз і забываюць камітэты камсамола факультэтаў. Незразумела таксама, па якой прычыне своечасова не была ўключана ў разнарадку падпіскі газета «Беларускі універсітэт». Адсюль і атрымліваецца многа недарэчнасцей, на якія спасылаюцца адказныя за падпіску на факультэтах, курсах і ў групах.

Г. НАУМЧЫК.

# ГОД ПРАЦЫ...

Стройная дзяўчына энергічна паднялася на сцэну і па-дзелавому пачала:

— Камсамольская арганізацыя факультэта бачыць сваю асноўную задачу ў тым, каб узброіць маладых спецыялістаў не толькі ведамі па матэматыцы, але і складанай навукай ідэйнага ўплыву на калектыў, уменнем выхоўваць, весці за сабой людзей.

Уважліва і напружана слухаюць прысутныя даклад сакратара камітэта камсамола матэматычнага факультэта Веры Пракашавай. Год упартай, клапатлівай працы застаўся ззаду, і зараз камсамольскі актыў сабраўся для таго, каб падвесці вынікі дзейнасці камсамольскай арганізацыі, выявіць недахопы і вызначыць шляхі далейшай работы.

Шмат карыснага было зроблена ў галіне ідэалагічнай работы. Адзначана ў дакладзе як актыўны і дзейсны орган газета «Рошым любую задачу». Добра працавала спартыўнае бюро. І ў гэтым вялікая заслуга Лашчанкі і Гарэліка.

А як абстаяць справы з вучобай? Аб гэтым гавораць лічбы. Па выніках вясенняй сесіі на выдатна здалі экзамены 175 чалавек, на добра і выдатна — 815. Спіс добрых спраў можна прадоўжыць. Але як у рабоце любой камсамольскай арганізацыі, так і ў рабоце камітэта камсамола матфака нямала недахопаў. Гэта і недастатковы кантроль камітэта і камсамольскага бюро за ростам ідэйна-палітычнага ўзроўню камсамольцаў, і прабелы ў інтэрнацыянальным выхаванні, і несур'ёзныя адносіны некаторых студэнтаў да вывучэння грамадскіх навук, і пасіўнасць лектарскай групы (кіраўнік Талочка), палавіна саставу якой ні разу не выступіла. Хто вінават у тым, што самадзейнасць не была масавай, мала праводзілася вечароў на патрэбным узроўні і заглохлі КВН? Чаму не ўмацаваліся сувязі з камсамольскімі арганізацыямі падшэфных саўгасаў, сельскіх школ? Адказы на гэтыя пытанні далі самі ўдзельнікі канферэнцыі.

Камсамольская работа вельмі адказны, важны і тонкі ўчастак грамадскай дзейнасці. Адказнасць за даручаную справу, зацікаўленасць у рабоце — асноўныя якасці, якімі павінен валодаць кожны камсамолец. Самае страшнае — абыякавасць, пасіўныя адносіны да падзей. І пакуль абыякавасць не ліквідавана, у многіх камсамольскіх арганізацыях на сходах выносяцца рашэнні — прызнаць работу здавальняючай. Такой адзнакай не павінна задавольвацца камсамольская арганізацыя.

Вучоба для студэнта — адна з галоўных задач. Як жа яна вырашаецца на матфаку? Аб гэтым расказаў загадчык акадэмічнага сектара Труш.

— Спачатку ў нас дрэнна была наладжана работа. А пасля акадэмічная камісія павяла барацьбу за паляпшэнне паспяховасці, узяла пад кантроль хвасцістаў і прагульшчыкаў. Я лічу, — працягвае Труш,— што трэба ўзмацніць кантроль за вучобай і наведваннем, хоць многія выкладчыкі супраць праверак. Пакуль што іншага выйсця няма.

З думкай працаваць па-сапраўднаму бяруцца за справу многія камсамольскія актывісты, у тым ліку старшыня СНТ аспірант Жыглевіч. Члены СНТ дапамагалі ў правядзенні матэматычных алімпіяд, прачыталі 47 лекцый аб універсітэце, аб факультэце ў школах па месцах жыхарства. Вось што расказаў аб рабоце СНТ Жыглевіч:

— У мінулым навучальным годзе члены СНТ прачыталі ў чатыры разы больш лекцый, чым у мінулыя гады. Прычым многія лектарскія выступленні былі вельмі добрымі. Апублікавана 7 навуковых прац. Добра былі пастаўлены заняткі гурткоў і работа ў школе юных матэматыкаў.

Цяжка працаваць так, каб не было недахопаў. Іменна на іх указала ў сваім выступленні т. Багданава.

— У цяперашні час асабліва актуальнае пытанне аб дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. СНТ недастаткова ўдзяляла ўвагі грамадскім навукам. Неабходна актывізаваць сваю дзейнасць па вывучэнню грамадскіх навук. Размова ідзе аб глыбокім авалоданні багатай спадчынай Ільіча.

1969 год — знамянальны, памятны, перадюбілейны год. Усе камсамольцы павінны быць патрабавальнымі да сябе і да сваіх спраў. Аб гэтым гаварыла ў сваім выступленні член камітэта З. Дамарацкая. У гэтыя знамянальныя дні патрэбна, каб кожны спытаў у сябе, што ён робіць з поўнай аддачай, а дзе яшчэ патрэбна прыкласці большае стараннe. 12 красавіка, адзначаючы 50-годдзе камуністычнага суботніка, быў дадзены старт ленінскаму заліку. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на вывучэнне ленінскіх работ, часцей выступаць з лекцыямі ў школах, на заводах, наведваць памятныя месцы, музеі. Можа варта арганізаваць дзень студэнта-прапагандыста.

Аб тым, якія цяжкасці прыйшлося выпрабаваць і як працавала рэдкалегія, расказаў рэдактар газеты матфака В. Калінін.

— У нашай рэдкалегіі 19 чалавек. А сапраўдных, якія пастаянна працуюць,— толькі 6. Матэрыялы з малодшых курсаў даводзілася «выбіваць». Сакратары камсамольскіх бюро патокаў ніякай дапамогі рэдкалегіі не аказвалі.

Выступаючыя гаварылі пераканана. Відаць было, што яны — сапраўдныя энтузіясты сваёй справы.

У заключэнне канферэнцыі член камітэта камсамола універсітэта І. Шынгель праанализаваў работу камсамольскай арганізацыі факультэта.

— Мы набліжаемся да слаўнай даты — 100-годдзя з дня нараджэння вялікага Леніна, — заканчвае сваё выступленне І. Шынгель. — Дазвольце пажадаць вам з новымі поспехамі сустрэць гэту дату.

**Л. ЦІТОВА,**
**студкар.**

*Вялікай папулярнасцю і павагай у школьнікаў горада Мінска карыстаецца школа юных матэматыкаў, створаная пры матфаку БДУ.*

*15 кастрычніка адбыліся чарговыя ўступныя экзамены, якія здавалі каля 500 вучняў дзевятых і дзесятых класаў.*

*НА ЗДЫМКУ: экзамены праводзяць энтузіясты матэматыкі (злева направа) кандыдат фізіка-матэматычных навук І. І. Комяк, малодшы навуковы супрацоўнік А. П. Садоўскі, стажор Н. Пушкарова, аспірант кафедры алгебры І. В. Бялько і аспірант кафедры матэматычнага аналізу А. С. Моткін.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*





СПОРТ

# І ЗНОЎ — ЖУРНАЛІСТЫ

КАМСАМОЛЬСКАЕ возера. Парк Перамогі. Да гэтага месца збіраліся ў мінулую нядзелю студэнты універсітэта. Тут праводзіўся традыцыйны асенні крос. На асеннія старты студэнты выйшлі ўпершыню ў суровыя пасляваенныя гады. А апошнія дзесяць год месцам правядзення кросаў выбіраецца толькі парк Перамогі. У гэтым ёсць свая прычына: і возера, і парк — працоўны плён моладзі Мінска, у тым ліку і студэнтаў універсітэта.

Сёлетні крос прысвечан 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

10 гадзін раніцы. Галоўны суддзя В. В. Зарэцкая адкрывае спаборніцтвы. На старт выклікаюцца студэнты юрфака, пасля гісторыкі, журналісты... Першыя забегі. Першыя вынікі. Студэнт факультэта журналістыкі Валерый Рыдкі пераадолеў кіламетровую трасу за 2 мін. 54 сек. Гэты вынік застаецца лепшым даволі доўга. Але вось стартуе студэнт фізфака першаразраднік Арнольд Казачонак. Ён адразу адрываецца ад асноўнай групы. Бяжыць лёгка, прыгожа, упэўнена. Балельшчыкі пацягнуліся да месца фінішу, чакаючы высокага выніку. І не памыліліся: 2 мін. 33,4 сек. — такі час, паказаны Арнольдам. За 2 мін. 45 сек. прабег Ігар Гуляеў (фізфак). У яго другое месца. Усяго на адну секунду горшы вынік у двух удзельнікаў кросу: у Віктара Краснапрошына (матфак) і Міхаіла Чабана (хімфак).

Сярод дзяўчат на дыстанцыі 500 метраў разгарнулася напружаная барацьба. У адным з забегаў студэнтка фізфака Валянціна Цагойка паказала добры час — 1 мін. 19 сек. Гэта на 3 секунды лепш за вынік пераможцы мінулагодняга кросу. Хутка Валя Бруцкая (матфак) паўтарае гэты час. А пасля адразу дзве спартсменкі Тамара Цімашкова (матфак) і Валя Бяляева (хімфак) паляпшаюць яго яшчэ на 4 секунды — 1 мін. 15 сек. Высокі вынік! Асабліва трэба адзначыць Т. Цімашкову: рэгулярна займацца яна пачала толькі год назад.

Але ўсё ж не поспехі адзіночак прыносяць камандзе перамогу ў кросе. Яго галоўнае адрозненне ад звычайных лёгкаатлетычных спаборніцтваў — масавасць, і перамагае той факультэт, у якога вышэйшы сярэдні вынік.

Як і ў мінулым годзе, лепшым аказаўся факультэт журналістыкі. На другім месцы — хімфак і на трэцім — геафак.

Нядрэнна было б, каб пераможцам уручаліся прызы. Відаць, камітэту камсамола універсітэта варта падумаць аб гэтым.

А. КУХАРЧУК,
В. ЯЦЭВІЧ.



КЛІЧУЦЬ ДАРОГІ... Фотаэцюд І. АСКІРКІ.

# Паэтычны куток

# Будзем знаёмы!

**На першым сёлетнім пасяджэнні ўзлётаўцаў было, як заўсёды, шмат першакурснікаў. Сёння мы змяшчаем вершы, што прагучалі на гэтым пасяджэнні — на добрае знаёмства, з пажаданнем: «У добры час!..».**

Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ

* * *

О сумнае бабіна лета
Нясмелых маўклівых надзей.
І песняй дзявочай нясмелай
Асенняя казка ідзе.

У маці—прыгожыя косы,
Няма ў іх яшчэ сівізны.
Бурштынныя буйныя росы
Асядуць на вейкі сасны.

І будзе нясцерпным
папрокам
Пытанне: «А дзе ж ты,
Васіль!
Юнацтва далёкія крокі
І луг, што яшчэ не скасіў!»

І думка абвострыцца болем,
Каснік знік даўно у Сажы.
«Даволі, даволі даволі»,—
У сэрцы звіняць капяжы,

О мудрае бабіна лета,
У роздуме светлым жыві.
Бацькоўская ласка
і ветласць
У сэрцы звіняць капяжы.

## БУРШТЫН

Асколак мора у руках,
І не заснуць у гэты вечар,
Бо ёсць надзея
на сустрэчу—
Асколак мора у руках.

І слова дзіўнае «спаткай»
Мне будзе вельмі недарэчы,
Бо тваіх пальцаў рух
хлапечы—
Асколак мора у руках.

Ля ўзножжа лашчыцца рака,
Як сум любві над доляй
нечай.
І дабрата, і чалавечнасць—
Асколак мора у руках.

І колкасць хвалі не гукай,
І гэту ўздыбленасць
сустрэчы.
Імгненні, што зліліся
ў вечнасць—
Асколак мора у руках.

Ніна СУПРУН



## ПАЧАТАК

Ёсць пачатак усяму —
Снегу, навальніцы,
Сінявокай, гаманкой,
Лугавой крыніцы,
Неабходжанай тайзе,
Мору-акіяну,
Ціха дрэмлючай лазе
І лясной паляне.
Ёсць пачатак цёплым дням
І начам марозным,
Незакілзаным вятрам,
Спеву птушак розных,
Зорам, сонейку майму,
Што так ярка свеціць!..
Ёсць пачатак усяму,
Усяму на свеце.

Валянціна ХАМЧУК

## АСЕННЯЕ



Ізноў лаўлю ў адкрытыя далоні
Змярцвеўшыя ад холаду лісткі,
І вецер гладзіць стомленыя скроні,
Вільготным студзіць дотыкам рукі.
Ледзь-ледзь працэдзіць сонца
праз аблокі
На дзіва сталы, стрыманы прамень.
Мінуўся час бяздумнай летняй
спёкі,
Яснее, халадзее кожны дзень.
І калі нават вочы не расплюшчыць,
Стараючыся ўпарта быць сляпой,
Няпрошана з'яўляецца відушчасць,
Рассейваецца неўпрыкмет спакой.

Янка КІБЕНЬ

## СВЕТЛАЮ МАРАЮ...

Светлаю мараю-знічкаю
Стрэў я каханне аднойчы.
Срэбнай гаючай крынічкаю
Ззялі дзявочыя вочы.
У квецень духмяную,
росную
Свой мы праводзілі вечар,
Каб васільковымі вёснамі
Сніліся першыя стрэчы.
Дзіўнымі казкамі веснімі
Ў сэрцы адклікнуцца
ночы,—
Той незабыўнаю песняю,
Што не паўторыцца двойчы.

* * *



Рукі лебедзямі бялеюць,
Хвальмі косы на плечы збягаюць,
Параўнаў бы цябе з лілеяй,
Толькі права такое ці маю?..
Я не ведаю сну і спакою,
Ты—пяшчота мая і гарэзнасць.
Хто ж прыдумаў цябе такою
Сярод белых чаромхаў і бэзу?..


# ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

на навукова-тэарэтычны часопіс

«ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА»

на 1970 год.

Часопіс выпускаецца чатырма серыямі:

1. **Матэматыка, фізіка, механіка.**
2. **Біялогія, хімія, геалогія, геаграфія.**
3. **Гісторыя, філасофія, эканоміка, права.**
4. **Філалогія, журналістыка.**

Усяго ў 1970 годзе выйдзе 12 нумароў часопіса, па 3 нумары ў кожнай серыі.

У «Весніку Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» публікуюцца навуковыя даследаванні тэарэтычнага, эксперыментальнага і практычнага характару.

Часопіс разлічан на прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў вну, навуковых работнікаў навукова-даследчых інстытутаў, навуковых устаноў і таварystваў, супрацоўнікаў фабрычна-заводскіх лабараторый.

Падпіска прымаецца на поўны гадавы камплект часопіса і на асобныя серыі.

**ПАДПІСНАЯ ЦАНА:**

Поўны камплект на год (12 нумароў) — 9 руб. 60 кап.

Асобная серыя на год (3 нумары) — 2 руб. 40 кап.

Цана асобнага нумара — 80 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА

усімі агенцтвамі «Саюздруку», аддзяленнямі сувязі і грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.


# АДКУЛЬ ПАЙШЛО?

**Белая ворона.**

Выражение это, как обозначение редкого, исключительного человека, находится в 7-й сатире римского поэта Ювенала (середина I в.—после 127 г. н. э.).

Рок дает царства рабам, доставляет пленным триумфы.

Впрочем, счастливец такой реже белой вороны бывает.

**Благоглупости.**

Слово, вошедшее в литературную речь из сочинений М. Е. Салтыкова-Щедрина: «Невинные рассказы. Деревенская тишь» (1865), «За рубежом» (1880), Употребляется в значении: пустяки, выдаваемые за серьезное дело, глупость, произносимая с важностью.

**Блажен, кто верует, тепло ему на свете!**

Цитата из комедии А. С. Грибоедова «Горе от ума» (1824), слова Чацкого.

**Блажен, кто смолоду был молод,**
**Блажен, кто вовремя созрел.**

Цитата из «Евгения Онегина» А. С. Пушкина.

**Блудный сын.**

Выражение возникло из евангельской притчи о блудном сыне. Выражение «блудный сын» значит: сын, вышедший из повиновения отцу. Иногда употребляется в значении: человек беспутный, нравственно нестойкий, но чаще в значении: раскаявшийся в своих заблуждениях.

**Бумага не краснеет. Бумага все терпит.**

Выражения эти восходят к римскому писателю и оратору Цицерону (106—43 гг. до н. э.). В его письмах «К друзьям» находится выражение: «Epistola nonerubestis» — «Письмо не краснеет», то есть письменно можно высказывать такие мысли, которые стесняются высказать устно.

**Была без радостей любовь,**
**Разлука будет без печали.**

Цитата из стихотворения М. Ю. Лермонтова «Договор».

**Быть можно дельным человеком,**
**И думать о красе ногтей.**

Цитата из «Евгения Онегина» А. С. Пушкина.

**Благими [добрыми] намерениями ад вымощен.**

Выражение приписывается английскому писателю Джонсону (1709—1784).

Благими намерениями вымощен ад, и в данном случае благие намерения не спасают еще от стихийного влечения по «линии наименьшего сопротивления», по линии **чисто буржуазной** программы» (В. И. Ленин. Что делать? Соч., т. 5, стр. 388—389).

Плехановское понимание предлагаемой им тактики не соответствует действительности. Поэтому благие намерения Плеханова служат лишь к мощению ада. (В. И. Ленин, Победа кадетов и задачи рабочей партии. Соч., т. 10, стр. 185).

**Бочка Диогена.**

Диоген (около 404—323 гг. до н. э.)—древнегреческий философ, принадлежащий к школе киников (циников). Высшей нравственной задачей киники считали подавление всех страстей, сведение всех потребностей к минимуму; возврат к «естественному», животному состоянию они признавали основой счастья и добродетели. Призывая довольствоваться малым, Диоген всем образом жизни доказывал пренебрежение к культуре. О нем сохранилось много легендарных рассказов. Передавали, например, что он жил в бочке, считая дом роскошью. На основе этого предания возникло выражение «бочка Диогена».

**Буриданов осел.**

Так говорится о человеке, находящемся в положении крайней нерешительности, колеблющемся в выборе между двумя равноценными предметами, равносильными решениями и т. п. Выражение это приписывается французскому философу-схоласту XIV в. Жану Буридану. В доказательство отсутствия свободы воли он привел в пример осла, который, находясь на одинаковом расстоянии между двумя равными охапками сена, должен бы умереть с голоду, так как при отсутствии какого-либо мотива к предпочтению одной охапки другой его обсолютно свободная воля не могла бы ни на одной из них остановиться и он не сдвинулся бы с места. Этого примера в сочинениях Буридана нет; возможно, что он привел его в устной беседе.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 17293. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1732. Тыраж 2000 экз.